**Надзея Скараход**
*Беларускі дзяржаўны універсітэт*

# РАДЫЁПРАГРАМА «ЗА І СУПРАЦЬ» ЯК ПРЫКЛАД ТРАНСФАРМАЦЫІ ТЭМАТЫЧНАЙ НАКІРАВАНАСЦІ

Праграма «За і супраць» з’явілася ў сетцы вяшчання Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё ў сезоне 2007–2008 гг. і была запатрабавана часам – на канале не хапала перадачы, якая б узнімала актуальныя пытанні ўсіх сфер жыцця грамадства і, больш за тое, мела б такі фармат, што мог бы зацікавіць слухача і далучыць яго да размовы.

Менавіта абмеркаванне злабадзённых і спрэчных пытанняў, важных для кожнага чалавека, кампетэтныя эксперты, «жывая» размова, выкарыстанне апытанняў, тэлефанаванняў у эфіры і творчая рэалізацыя задум – усё гэта выгадна адрознівае праграму ад іншых.

За час існавання – яна ў эфіры другі год – былі абмеркаваны такія тэмы, як «Платная і бясплатная медыцына», «Дыспансерызацыя: за і супраць», «Жыццё ў крэдыт», «Беларускі шоу-бізнес», «Ці модна насіць беларускае?», «Работа за мяжой», «Хто часцей парушае правілы дарожнага руху: пешаходы ці вадзіцелі?», «Ці ёсць у сучасным жыцці месца для паэзіі?», «Размеркаванне студэнтаў ВНУ», «Будучае кнігі», «“Грамадзянскія” шлюбы: за і супраць». Як бачна, тэматыка праграм разнастайная, закранае розныя праблемы сацыяльнага жыцця, а абмеркаванне носіць аналітычны характар.

Зразумела, што многія з гэтых актуальных пытанняў былі і застаюцца пад увагай журналістаў. І тым самым – пад увагай грамадства, аўдыторыі канала, якія прапануюць карэктывы ў агульнадзяржаўныя праграмы і дакументы. І некаторыя з абмеркаваных тэм упершыню так усебакова, дэталёва і дынамічна абмеркаваны ў праграме. Яна мае шырокі спектр тэматычнай скіраванасці і дакладную форму, – і тым самым пакідае адкрытымі тэматычныя рамкі. «За і супраць» – яскравы прыклад змянення тэматычнай накіраванасці праграм грамадска-палітычнага вяшчання: тэмы, якія абмяркоўваюцца, хвалююць беларусаў, яны надзённыя для кожнага, і гэта яшчэ больш набліжае праграму да слухача.

Удала знойдзены фармат: калі кожны з журналістаў – а вядучых у праграме двое – выбірае сваю пазіцыю, якую імкнецца даказаць разам з групай запрошаных экспертаў, другі бок мае супрацьлеглае меркаванне, падмацаванае сваімі аргументамі.

Акрамя таго, варта адзначыць такі аспект, як музычнае афармленне праграмы. Арыгінальная мызыка, напісаная спецыяльна для гэтай перадачы, адлюстроўвае напружанасць абмеркаванння, перадае спрэчнасць і надзённасць тэм. У гэтым вяшчальным сезоне музычнаму афармленню была нададзена значная ўвага, сведчаннем чаго з’яўляецца стварэнне аддзела эфірнага дызайна, які займаецца распрацоўкай такога важнага для радыё аспекта, як музычнае афармленне.

Пра запатрабаванасць праграмы дынамічнага фармату з тэматычным «рознагалоссем» сведчаць меркаванні слухачаў, якія тэлефануюць і дасылаюць у эфір SMS, каб выказаць свае думкі і прапанаваць злабадзённыя тэмы. Важны таксама і такі аспект, як павелічэнне гучання праграмы да 30 хвілін і выдзяленне для яе прома-тайма – 13 гадзін, у суботу.